# АЗНАЯМЛЕННЕ ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГА ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ З ПАЭЗІЯЙ

**(ад 5 - да 6 года жыцця)**

## Тэма . Лета

### Расказванне М. Танка “Жук і слімак”. Завучванне верша Я. Коласа “На лузе”

*Праграмны змест* **:** вызваць у выхаванцаў эмацыянальны водгук на летнія замалёўкі паэтычнага апісання прыроды, паглыбляць уяўленні дзяцей пра адпаведнасць назвы тэкста яго зместу, падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна расказваць верш напамяць. Развіваць у іх выразнасць голасу пры чытанні верша, інтанацыйнаую разнастайнасць перадачы тэксту ў залежнасці ад перадачы малюнкаў летняй прыроды.

*Матэрыял*:малюнкі або фотаздымкі летніх пейзажаў, аудыязапіс спявання птушак, трашчання конікаў, стракозак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ход

- Паслухайце , што гэта за гукі?(аудыязапіс)
- Якія гукі вы пачулі?
- У якую пару года можна пачуць песні птушак, трашчанне конікаў, стракозак?
- Ці былі вы на лузе летам?
- Што цікавага вы там убачылі?

- Пра тое, як добра на лузе летам, паслухайце верш Якуба Коласа, які так і называецца “На лузе”

**На лузе**

Добра ў лузе ў час палудны!
   Лёгка там дыхнуць!
Хмаркі белыя марудна
   За лясы плывуць.
Ветрык краскі чуць калыша,
   Травы шалясцяць,
Луг зялёны жыццём дыша –
   Конікі трашчаць.
У лозах шчэбет не сціхае,
   Шум стаіць і свіст,
Ў яркім бляску спачывае
   На ракіце ліст.

*Якуб Колас*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Чаму на лузе добра ў час палудны?
- Раскажам разам з вамі пра тое, як добра на лузе летам. Я буду пачынаць расказваць словамі з верша, а вы дагаворваць паэтычныя радкі.
- Там лёгка ... *дыхнуць.*
- Там хмаркі белыя марудна ... *за лясы плывуць.*
- Ветрык на лузе краскі… *чуць калыша,* травы ... *шалясцяць,*
- Луг зялёны жыццём дыша – конікі ... *трашчаць.*

- У лозах шчэбет не сціхае, стаіць *...шум і свіст,*

- Ў яркім бляску спачывае на ракіце... *ліст.*

- Паслухайце верш яшчэ раз, будзем яго расказваць напамяць.

- Вось тут на малюнках адлюстраваны хмаркі, краскі і травы, конікі, лозы, ліст ракіты. Я пастаўлю гэтыя малюнкі ў той паслядоўнасці, як пра іх расказваецца ў вершы, каб вам было лягчэй яго запомніць.

- Слухайце верш.

- Цяпер раскажыце яго ( 4-5 дзяцей).

- А зараз паслухайце верш, у якім расказваецца, што аднойчы летнім ранкам адбылося на лузе .

- Верш называецца “Жук і слімак”. Напісаў яго М. Танк.

**Жук і слімак.**

Пагодным летнім ранкам
На лузе за сялом
Сустрэўся жук аднойчы
З рагатым слімаком.

- Здарова!—жук вітае.—
Куды, браток, ідзеш?
І з ракавіны хатку
Нашто з сабой нясеш?

Абцёр слімак пот з твару,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Гаворыць так жуку:

- Нямала перажыць мне

Прыйшлося на вяку.

То сцюжа. То марозы,

То навальніца, дождж,

То часам у дарозе

Захопіць змрок і ноч.

Шукай тады начлегу

Пад нейкім пад кустом...

Вядуць размову гэтак

І раптам чуюць – гром.

Ударыў дождж краплісты.

І жук пабег шукаць

У засені цяністай

Шырокага лістка.

Але на цэлым лузе

Няма страхі нідзе,

І мокры, ледзь жывы ён

Да слімака ідзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Пусці, браток, пагрэцца,

Змок дужа на лугу,

Насіць за гэта хатку

Табе дапамагу.

У ракавіне шчыльнай

Вандроўнікі сядзяць.

І нават дождж краплісты

Не зможа ў ёй дастаць.

Але мінулі хмары,

І сонца ўстала зноў.

Жук хатку слімакову

Пакінуў і пайшоў.

Забыўся пра нягоды,

І не на ўме жуку,

Што абяцаў паднесці

Ён хатку слімаку.

*М. Танк*

- Каго сустрэў жук на лузе?
- Чаму слімак носіць сваю хатку з сабой?
- Як дапамог слімак жуку?
- Ці выканаў жук, тое, што абяцаў слімаку?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма . Мая сям'я

**Расказванне вершаў Ул. Паўлава « Пакланіся добрым людзям», Э. Агняцвет «Саўка за сталом». Расказванне напамяць верша Т. Кляшторнай « Ветлівыя словы»,**

*Праграмны змест*: садзейнічаць развіццю ў дзяцей умення адчуваць і разумець характар верша, маральны сэнс твора, узаемасувязь апісанага ў вершы з рэальным жыццём. Актывізаваць лексіку выхаванцаў па тэме : "Ветлівыя словы". Пабуджаць дашкольнікаў да ўспаміну вершаў, якія завучваліся напамяць раней. Фарміраваць у дзяцей этычныя навыкі зносін.

*Матэрыял:* малюнкі рэальных жыццёвых сітуацый, якія адлюстроўваюць неабходнасць ужывання ветлівых слоў.

Ход

- Назавіце, калі, ласка, ветлівыя словы.
- Калі ужываюць гэтыя словы?
- Паслухайце верш, які называецца " Пакланіся добрым людзям".

**Пакланіся добрым людзям**

Век дзяліся тым, што маеш, --

Хлебам-соллю, казкай-краскай.

Ну а ў госці запрашаеш,

Гавары ўсім:

**-- Калі ласка!**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А з табой як тое будзе,

То за шчодры знак усякі

Пакланіся добрым людзям

І скажы ім шчыра:

-- **Дзякуй!**

*Уладзімір Паўлаў*

- Назавіце ветлівыя словы, якія вы пачулі ў вершы.

- Раскажыце словамі з верша, калі ўжываюць гэтыя словы.

- Знайдзіце гэтыя жыццёвыя сітуацыі на малюнках і растлумачце, чаму вы выбралі менавіта гэтыя малюнкі.

- Паслухайце яшчэ адзін верш. Тут таксама ёсць ветлівыя словы. Запомніце ветлівыя словы, якія сустракаюцца ў гэтым вершы.

Добра, калі ўжо змалку

Сам можаш **вітаць** людзей,

Раніцай: -- **Добрага ранку!**

І апоўдня: -- **Добры дзень!**

Увечары пры сустрэчы

Знаёмым сказаць: -- **Добры вечар**!

А соннаму сонейку нанач

І ўсім добрым людзям : -- **Дабранач**!

*В. Вітка.*

- Назавіце ветлівыя словы з верша.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Прыпомніце і раскажыце, калі гавораць кожнае ветлівае, пра якое расказваецца ў гэтым вершы? Знайдзіце малюнкі , на якіх адлюстраваны сітуацыі, калі вітаеш людзей ці знаёмаму пры сустрэчы гаворыш “ Добры вечар”.

- Раней мы з вамі вучылі верш “ Ветлівыя словы”. Давайце разам успомнім яго.

**Ветлівыя словы**

“Калі ласка”. “дзякуй”. “добры дзень” –

Ветлівыя словы

Чую ад людзей.

Ветлівымі словамі

Трэба даражыць,

З ветлівымі словамі

Лёгка жыць.

*Тадзіяна Кляшторная*

- Назавіце ветлівыя словы , пра якія расказваецца ў вершы?
- Ад каго мы чуем ветлівыя словы?
- А для чаго іх гавораць?
- Чаму трэба даражыць ветлівымі словамі?
- Раскажыце гэты верш яшчэ раз.( 2-3 разы)
- Добра, калі ведаеш не толькі ветлівыя словы, але і правілы паводзін.

- Ц і ведаеце вы як трэба паводзіць сябе за сталом , калі снедаеш, абедаеш або вячэраеш? Раскажыце.

- Паслухайце верш Э. Агняцвет пра тое, як Саўка паводзіць сябе за сталом?

**Саўка за сталом**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ляжаць ля талеркі

Відэлец і нож

Дзве чыстыя лыжкі ляжаць.

-- Ну і што ж?

Ляжаць – хай ляжаць, іх не буду чапаць.

Яны ж не чапаюць мяне і маўчаць.

З талеркі ён сёрбае крупнік – ой-ой!

Кавалачак мяса хапае рукой.

Ен пальцамі ловіць у шклянцы кампот,

Абрусам ёе выцер і шчокі і рот.

Відэлец не ўцерпеў:

-- За цэлы мой век

Мне трапіўся першы такі чалавек!

Ускочыла лыжка

І ну рагатаць:

-- Хі-хі, ха-ха-ха,

Ён дурненькі, відаць!

Саскочылі разам яны са стала –

Ніякая сіла спыніць не магла.

Відэлец, і лыжка, і нож – ля дзвярэй.

Збянтэжыўся Саўка:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-- Чакайце, э-гэй!

Усе уцякаюць, вяртацца не хочуць.

-- Хі-хі, ха-ха-ха! – толькі лыжкі

рагочуць.

*Эдзі Агняцвет*

- Які посуд паўцякаў ад Саўкі?

- Чаму паўцякаў ад Саўкі ўвесь посуд?

- Растлумачце Саўку, як неабходна правільна паводзіць сябе за сталом.

## Тэма. Восень.

### Расказванне верша П. Панчанка "Месяцы года". Завучванне верша С. Грахоўскага "Сонечная сцежка"

*Праграмны змест*: замацаваць веды дзяцей аб месяцах года, іх вобразных характарыстыках; падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна расказваць верш напамяць. Развіваць у дзяцей выразнасць голасу пры чытанні верша , уменне выражаць свае ўяўленні ў вобразным слове. Вызваць у іх пачуццё захаплення перад прыгажосцю роднай прыроды.

*Матэрыял:*малюнкі або фотаздымкі восеньскіх пейзажаў.

Ход

- Памятаеце казку пра дванаццаць месяцаў. Дванаццаць месяцаў складаюць цэлы год. Ці можаце вы пералічыць месяцы года?

- Назавіце вясновыя месяцы? (летнія месяцы? восеньскія месяцы? зімовыя месяцы?)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-Паслухайце, як расказвае паэт Пімен Панчанка  пра кожны месяц года ў вершы “Месяцы года”.

**Месяцы года**

Студзень – з казкамі снежных аблокаў,
Люты – шчодры на сіні мароз,
Сакавік – з сакатаннем і сокам
Беларускіх вясновых бяроз,
Красавік – час маланак і ліўняў,
Травень – з першым мурогам, сяўбой,
Чэрвень – з ягаднаю зарой,
Ліпень з мёдам,
З пшаніцаю – жнівень,
Спелы яблычны верасень,
Багаты кастрычнік
У празрыстасці чыстай, крынічнай,
Лістапад – залаты лістапад,
Снежань – першы густы снегапад.

*Пімен Панчанка*

- Пералічыце месяцы, пра якія расказваецца ў вершы.

- Давайце разам раскажам з чым параўноўвае паэт кожны месяц года.

Студзень – з казкамі ... *снежных аблокаў,*
Люты – шчодры на сіні ... *мароз,*
Сакавік – з ... *сакатаннем і сокам*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Беларускіх вясновых бяроз,

Красавік – час... *маланак і ліўняў,*

Травень – з першым ... *мурогам, сяўбой,*

Чэрвень – з ... *ягаднаю зарой,*

Ліпень з ... *мёдам,*

З пшаніцаю – жнівень,

Спелы яблычны верасень,

Багаты кастрычнік

У празрыстасці чыстай, крынічнай,

Лістапад – залаты лістапад,

Снежань – першы густы...*снегапад.*

- Пра якія восеньскія месяцы ідзе размова ў вершы?

- Які першы месяц восені, другі, трэці?

- Паслухайце яшчэ раз, як прыгожа пра гэтыя месяцы расказвае П. Панчанка.

Спелы яблычны верасень,

Багаты кастрычнік

У празрыстасці чыстай, крынічнай,

Лістапад – залаты лістапад.

- Давайце разам раскажам пра розныя перыяды восені.

"Спелы яблычны верасень" – гэта які перыяд восені? (*ранняя восень).*

- Знайдзіце на малюнках раннюю восень і растлумачце, чаму вы выбралі гэтыя малюнкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“ Багаты кастрычнік у празрыстасці чыстай, крынічнай” – гэта... *( інтанацыяй запрасіць дзяцей да адказу)... сярэдзіна восені*. У гэтую пару восені часта ідуць ... *дажджы.* Неба бывае *...пахмурным, ...* .

- Знайдзіце малюнкі, на якіх адлюстравана сярэдзіна восені. Растлумачце, чаму вы выбралі гэтыя малюнкі.

“Лістапад – залаты лістапад” – гэта... позняя восень. Лісце ападае на ... *зямлю.* Дрэвы стаяць амаль што ... *голыя.*

- Знайдзіце малюнкі, на якіх адлюстравана позняя восень. Растлумачце, чаму вы выбралі гэтыя малюнкі.

- Паслухайце верш С. Грахоўскага “Сонечная сцежка”.

**Сонечная сцежка**

Жоўты лісцік тапаліны
Ціха падае з галіны;
І лісты, лісты наўкол
Апускаюцца на дол.

Высцілае лістапад
Сцежку ў наш дзіцячы сад.
Спрытна ходзяць ножкі
Сонечнай дарожкай.

*Сяргей Грахоўскі*

- Назавіце, пра якую пару восені расказвае паэт?
- Чаму, гэта залатая восень?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Куды  падае з галіны жоўты лісцік тапаліны і лісты, лісты наўкол?
- Што высцілае лістапад?
- Чаму паэт назваў дарожку сонечнай?
- З чаго гэта сонечная дарожка?
- Як можна назваць дарожку з жоўтых лісцікаў інакш?
- Паслухайце вершык яшчэ раз. Будзем яго расказваць напамяць, а вечарам раскажам маме і тату. (расказваюць 4-5 дзетак).
- А цяпер паспрабуем расказаць інакш, па – двое.Дамоўцеся паміж сабой , хто будзе расказваць першы слупок , а хто другі.( раказваюць 2-3 пары).

**Тэма.  Восень**

**Расказванне вершаў П. Броўкі "Надыход восені", Я.Коласа "Адлёт жураўлёў", В. Віткі "Лістапад"**

*Праграмны змест:* замацаваць веды дзяцей аб восеньскіх прыкметах, вызваць у іх эмацыянальны водгук на малюнкі прыроды восенню, жаданне выразіць свае ўяўленні ў вобразным звязным маўленні. Пабуджаць дзяцей да параўнання апісання восеньскай прыроды ў вершах і ў рэпрадукцыі карціны В.К. Бялыніцкага-Бірулі "Задумлівыя дні восені"

*Матэрыял:* рэпрадукцыя карціны В.К. Бялыніцкага-Бірулі "Задумлівыя дні восені"

Ход

- Паглядзіце на рэпрадукцыю карціны В.К. Бялыніцкага-Бірулі .
- Якую назву можна даць гэтай карціне?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Якія прыкметы, адлюстраваныя ў карціне, вам падказалі, што гэта восень?

- Паслухайце, як апісваюцца восеньскія прыкметы ў вершы П. Броўкі “Надыход восені”.

**Надыход восені**

Вось і лета сышло,
Адспявалі калоссі,
Цяжка нам заўважаць,
Як з’яўляецца восень.

Непрыкметна зусім –
Прыплыве павуцінкай,
Гляне жоўтым лістком
З-пад зялёнай хусцінкі.

Усплыве туманом
Над рачулкаю соннай,
Устрывожыць дымком
З пахам бульбы пячонай.

Зачаруе агнём
Маладзенькай рабіны,
На адлёце крылом
Памахае буслінай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А пасля

А пасля

Ліст апошні сарвецца...

Ды не знаю, чаму

Ты мне , восень, па сэрцу.

*П. Броўка*

- Ці супадаюць прыкметы восені, адлюстраваныя ў рэпрадукцыі карціны, з прыкметамі восені ў вершы?

- Як вы думаеце, на рэпрадукцыі карціны адлюстравана ранняя восень ці позняя?

- Пра якую пару восені расказваецца ў вершы?

- Раскажыце словамі з верша аб надыходзе восені.

- У вершы гаворыцца, што восень зачаруе агнём маладзенькай рабіны. Як можна расказаць пра гэтую прыкмету восені інакш?

- Як вы растлумачыце выраз з верша, што восень "на адлёце крылом памахае буслiным"?

- У пачатку восені птушкі ляцяць у цёплыя краіны. Паслухайце, як гэтую пару апісвае Якуб Колас ў вершы "Адлёт жураўлёў"

**Адлёт жураўлёў**

Белыя валокны

Сцелюцца над долам.

Не спяваюць птушкі,

Сціхнуў лесу шолам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Замірае лета,

Заціхаюць далі,

Сірацее рэчка,

Халадзеюць хвалі.

У бязмежным небе

Роўненькім шнурочкам

Жураўлі на вырай

Мкнуцца над лясочкам.

*Я. Колас*

- Апішыце словамі з верша, тую пару восені, калі птушкі ляцяць у вырай.

- Як называецца  восеньскае з'ява, калі пачынае ападаць лісце з дрэў?

- Паслухайце верш В. Віткі , які так і называецца "Лістапад"

**Лістапад**

Як малое птушанятка,

Перабег лісток дарожку,

Кінуўся за жоўтым статкам,

Мільганулі толькі ножкі.

Закружылі па асфальце

За чародкаю чародка,

Любыя не адлятайце –

Будзе вырай ваш кароткі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Зменіцца зіма вясною,

Узляціце зноў на дрэвы.

Зноў шчасліваю парою

Я пачую вашы спевы.

*В. Вітка.*

-З кім параўноуваецца ў вершы жоўты лісцік?

- З чым бы параўналі жоўты лісцік вы?

- Што гэта за жоўты статак, да якога перабег лісток дарожку?Як можна расказаць пра гэта іншымі словамі?

- Як расказваецца ў вершы пра лістапад?

- У вершах, з якімі мы сёння пазнаёміліся расказваецца пра тое, што ўвосень змаўкае лесу шолам, паяўляецца шмат белай павуціны . Пра якія яшчэ прыкметы восені вы пачулі ў вершах? Пагуляем, хто больш назаве восеньскіх прыкмет радкамі з вершаў.

## Тэма . Восень

### Адгадванне вершаваных загадак Р. Барадуліна “Загадкі на градках”

*Праграмны змест:* замацаваць уяўленні дзяцей пра жанравыя асаблівасці, прызначэнне загадак, іх адрозненне ад твораў другіх жанраў, развіваць у выхаванцаў уменне адгадваць вершаваныя загадкі. Садзейнічаць развіццю ў дзяцей ўмення самастойна падбіраць азначэнні для апісання агародніны.

*Матэрыял:*агародніна ( натуральныя прадметы або муляжы)

Ход

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- У народзе кажуць: “Вясна багатая кветкамі, а восень палеткамі”, “ Увосень за стол просім”, “ Увосень кожная хата пладамі багата”.
- Якую агародніну збіраюць увосень на градках?

- Паслухайце верш Рыгора Барадуліна “Загадкі на градках”, знайдзіце адгадкі на загадкі ў кошыку з агароднінай.

**Загадкі на градках**

У гародзе каля градак
Шмат цікавых ёсць загадак.
Той, хто градкі даглядае,
Той загадкі адгадае.

От бабуля важна села
і глядзіць навокал смела.
У зямлю схавала лапаць,
як зачэпіш – будзеш плакаць.
Гэта злосная бабуля
Называецца ...(цыбуля).

- Пра што гэтая загадка?
- Як вы здагадаліся, што гэта цыбуля?
- Якія прыкметы цыбулі падказалі вам адгадку.
- З кім параўноўваецца цыбуля ў загадцы? Чаму?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У бабулі родны брат

Ласкавейшы быццам,

А да слёз давесці рад,

Так, як і сястрыца.

Ты не вельмі плач, сынок,

Калі шчыплецца ...(часнок).

- Назавіце яшчэ раз адгадку.
- Якія аднолькавыя прыкметы ў часнака і цыбулі?

Не сыдзе з месца

Ні на крок,

Зарыўшыся ў пярыну.

Цярэбіць ціхі вецярок

Зялёную чупрыну.

Ды выцягнуць з перыны –

Пачырванее небарак .

Вядома, што гэта ... ( бурак).

- Пра што гэтая загадка?
- Як вы разумеце выраз "зялёная чупрына"? Скажыце іншымі словамі.
- Што азначае выказванне, што бурак не сыдзе з месца ні на крок, зарыўшыся ў пярыну.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- З чым параўноўваецца ў загадцы зямля?
- Якога колеру заўжды бурак?

Гэта што за важны туз,

Хвост зялёны,

Чэпкі вус?

Усім вядомы карапуз

Пузан Пузанавіч ... (гарбуз)

- Якая тут адгадка?
- Якія прыкметы гарбуза падказалі вам адгадку? Пералічыце іх.
- Чаму гарбуз ў загадцы называюць Пузан Пузанавіч?
- Малайцы, правільна адгадалі ўсе загадкі з градкі.
- Скажыце, а што такое загадка?
- Як яна адрозніваецца ад верша? апавядання?
- Тыя загадкі, што вы адгадвалі былі падобныя на вершы або не?
- Чым гэтыя загадкі адрозніваюцца ад вершаў?
- Сапраўды, у загадцы прадмет не называецца і неабходна самому здагадацца пра што ідзе размова.
- Што дапамагло вам адгадаць гэтыя загадкі?
- Так, па першае рыфма, а па-другое апісанне прыкмет агародніны.
- Паспрабуйце самі апісаць агародніну, каб потым вы маглі складаць пра яе загадкі.

– цыбуля, якая? *... горкая, залацістая, круглая, расце на градцы*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-- бурак – *круглы, бардовы,чырвоны, цвёрды, расце на градцы*

-- морква – *аранжавая, доўгая, салодкая, расце на градцы*

-- гарбуз -- *круглы, жоўты, унутры зерне, расце на градцы*

-- агурок – *зялёны, доўгі, расце на градцы, у бочцы салёны*

-- памідор – *чырвоны, круглы, сакавіты, расце на градцы, мяккі*

-- бульба – *жоўтая, круглая або авальная, цвёрдая, смачная, калі зварыць, расце на градцы.*

- Паслухайце яшчэ раз верш “ Загадкі на градках”, Наступны раз паспрабуем скласці свае загадкі пра агародніну, аб якой вы пачулі ў гэтым вершы.

## Тэма. Аб прафесіях

**Расказванне вершаў Э. Агняцвет “Хто пачынае дзень”, А. Астрэйка “Размова аб прафесіях”, Я. Купалы “Хлопчык і лётчык”.**

*Праграмны змест*: актывізаваць лексіку дзяцей па тэме “ Праца дарослых”, развіваць у іх уменне разумець вобразы людзей розных прафесій, пра якія расказваецца ў вершах, адчуваць узаемасувязь апісанага з рэальным жыццём; падтрымліваць у дзяцей жаданне выразіць свае ўяўленні ад успрымання паэтычнага слова ва ўласных звязных выказваннях і малюнках.

*Матэрыял:* карцінкі людзей розных прафесій.

Ход

- Паглядзіце на гэтыя карцінкі. На іх адлюстраваны людзі розных прафесій. Назавіце, да якой прафесіі належыць кожны з іх.

- Паслухайце верш Э. Агняцвет “Хто пачынае дзень”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Хто пачынае дзень?**

Раней за ўсіх устаў шафёр,

Пабег да гаража.

Не любіць соннай цішыні,

Гарачая душа!

Ён – неспакойны чалавек –

Хацеў бы сто гадоў

Цагліны цёплыя вазіць

Для новых гарадоў.

Устане рана хлебапек,

Адчуе смачны пах,

І пойдзе жытні свежы хлеб

З румянцам на шчаках.

Па-свойму радуе маляр

Прыроду і людзей

Прыносіць колеры вясны

Вясёлы чарадзей.

Спытайся ў сонца і зямлі,

Спытайся  ў чыстых рэк :

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-- Хто пачынае новы дзень?

-- Рабочы чалавек!

*Эдзі Агняцвет*

- Назавіце прафесіі, аб якіх ідзе размова ў вершы?

- Хто пачынае новы дзень?
- Рабочы чалавек, гэта і шафёр, *... і... працягвайце далей , ... і...*
- Усе гэтыя прафесіі каштоўныя для нашай краіны і для ўсіх людзей.
- Растлумачце, чым каштоўныя гэтыя прафесіі для людзей?
- Паслухайце, як расказвае пра розныя прафесіі ў вершы “ Размова аб прафесіях”

А. Астрэйка.

**Размова аб прафесіях**

Раз сышліся на двары

Юныя рамеснікі

І пачалі гаварыць

Аб сваіх прафесіях:

Што каштоўней, што важней

Для краіны і людзей.

-- Я шліфую, я тачу

Рэчы далікатныя,

Справу токара лічу

Самаю выдатнаю,

Нават трактар без мяне

Кола з месца не скране.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

-- Муляр з цэглы дом кладзе,

Сценка ў сценку роўныя.

Вы не знойдзеце нідзе

Працы больш шаноўнае.

Дзе ні вуліца, ні пляц,

Як паглядзіш – мой палац.

-- Што ты нам ні гавары –

Вушы не развешу я,

Я за слесара, сябры,

Вось дзе дык прафесія.

Ні замок, ні нож, ні крук

Без маіх не зробіш рук.

-- За варштатам я стаю,

Тку адменнай пражаю,

Я прафесію сваю

Лічу самай важнаю.

Апранаю я народ

У бастон і каверкот.

-- А вось справа швейная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Самая надзейная:

Абыходзіць голка свет,

Кожны голкаю адзет.

-- А шавец? Браток, уваж!

Чым жа не выдатны я?

Вы без ботаў, без гамаш

Ні на што не здатныя:

А ў абутку – любата,

Ці мароз, ці хлюпата.

-- Дайце слова, мне пара,

Марна вокал ходзіце,

Лепшай, чым у друкара,

Працы вы не знойдзеце.

Без кніжак ды газет

Не абыходзіцца ўвесь свет.

Слаўны беларускі край,

Моладзі жыць весела,

Ты любую выбірай

Сам сабе прафесію:

Навучайся і працуй,

Толькі сілы не шкадуй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*А. Астрэйка*

- Знайдзіце на малюнках людзей пра прафесіі, якіх гаворыцца ў вершы.

- Раскажыце, якую карысць прыносіць справа, якой займаюцца людзі гэтых прафесій.

- Кожны з вас можа выбраць прафесію сабе сам. Якой прафесіі вы жадаеце навучыцца? Чаму?

- Вось Алесь хоча стаць лётчыкам. Чаму ты хочаш стаць лётчыкам, Алесь?

Вядомы наш беларускі паэт Я. Купала напісаў верш, які называецца “Хлопчык і лётчык”

- Паслухайце гэты верш.

**Хлопчык і лётчык**

-- Мой мілы таварыш, мой лётчык.
Вазьмі ты з сабою мяне!
Я – ведай – вялікі ўжо хлопчык
І ўмею ўжо лётаць у сне.

Мне мама сягоння казала.
Што стукнула мне ўжо сем год.
Табе гэта, можа , і мала,
А мне ляцець толькі ў палёт.

Вазьмі ж мяне, мяне, лётчык, хачу я
Пабыць у людзях, паглядзець,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як месяц на небе начуе,

Як блукае ў лесе мядзведзь.

Як свецяцца ночкаю зоры,

А днём не відаць іх чаму,

Як рэчкі ў далёкія моры

Улетку плывуць і ўзіму.

На моры зірнуць хоць раз вокам,

Як ходзяць па іх караблі,

Ляцеці далёка, высока

Ды так пабываць і ў Крамлі.

Вось гэтак у добрым здароўі

Мы будзем ляцець і ляцець.

Вазьмі ж мяне, лётчык, з сабою,

Не будзеш ты клопату мець.

*Я. Купала*

- Што просіць у лётчыка хлопчык?

- Дзе хоча пабываць хлопчык і што ён хоча пабачыць?

- Паслухайце яшчэ раз ўрывак з гэтага верша, дзе хацеў пабываць хлопчык, аб чым ён марыў.

Вазьмі ж мяне, мяне, лётчык, хачу я

Пабыць у людзях, паглядзець,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як месяц на небе начуе,

Як блукае ў лесе мядзведзь.

Як свецяцца ночкаю зоры,

А днём не відаць іх чаму,

Як рэчкі ў далёкія моры

Улетку плывуць і ўзіму.

На моры зірнуць хоць раз вокам,

Як ходзяць па іх караблі,

Ляцеці далёка, высока

Ды так пабываць і ў Крамлі.

- Вы пачулі, дзе хацеў пабываць маленькі хлопчык, а дзе хацеў бы пабываць кожны з вас?

- Намалюйце , дзе вы хацелі б пабываць?

Пасля малявання можна прапанаваць дзецям расказаць пра свой малюнак .

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма. Мая Радзіма.

### Расказванне вершаў пра Радзіму “ Хто я?” В. Віткі, “Чатыры пажаданні” А. Мілюця.Расказванне вершаў напамяць “ Блакіт нябёс” С. Сокалава-Воюша, “Беларусачка” А. Бадака,

*Праграмны змест:* садзейнічаць развіццю ў дзяцей умення адчуваць і разумець змест вершаванага твора, усведамляць узаемасувязь апісанага з рэальным

жыццём. Выхоўваць у дашкольнікаў любоў да Радзімы, гонар за яе. Развіваць навыкі вобразнага звязнага маўлення, выразнага чытання раней завучваемых вершаў напамяць.

*Матэрыял:* карта Беларусі .

Ход

- Паглядзіце на гэтую карту, назавіце, якой яна краіны?

- Хто жыве ў Беларусі?

- Пра тое хто ён, хоча даведацца і хлопчык з верша В. Віткі "Хто я?"

**Хто я?**

Узяў мяне одум:
Хто я такі, адкуль родам?
І дазнацца ў мамы мусіў –
Беларус я, з Беларусі.

*В. Вітка*

- Ці аднолькавая ў вас Радзіма з хлопчыкам, пра якога расказваецца ў вершы?

- Раскажыце словамі з верша, пра што дазнаўся хлопчык у мамы?

- Успомніце верш, што мы вучылі раней, дзе расказваецца пра хлопчыка, які нарадзіўся ў Беларусі .

- Хто хоча расказаць гэты верш? Раскажыце яго з гонарам за родную Беларусь.

**Блакіт нябёс**

Блакіт нябёс ... і белы бусел,
І кветкі ў полі, як абрус ...
Мой край завецца Беларуссю,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А сам я –хлопчык- беларус.

*С. Сокалаў-Воюш.*

-- А цяпер успомніце верш, дзе расказваецца пра дзяўчынку, якая нарадзілася ў Беларусі.

- Хто жадае расказаць гэты верш? Раскажыце яго так, каб усе пачулі, што вы, як і маленькая дзяўчынка, любіце родную краіну.

**Беларусачка**

Твар румяненькі,

Белая хустачка

Я ўжо ведаю,

Я – беларусачка!

І хачу

Так, як тата і мама,

Родны край свой любіць

Я таксама!

*А. Бадак*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Давайце раскажам разам пра нашу радзіму.

- Наша Радзіма завецца... – *Беларусь.*

- У Беларусі жывуць ... *беларусы.*

- Хлопчык завецца ... *беларус*, а дзяўчынка – ... *беларусачка.*

- Наша родная мова – ... *беларуская.*

- Паслухайце , як расказвае пра нашу Айчыну ў вершы “Чатыры пажаданні” А. Мілюць.

**Чатыры пажаданні**

Беларусам я радзіўся,

Беларусам буду жыць,

Беларускую зямельку

Буду шчыра я любіць.

Бо радзімая старонка

Над усё мне прыгажэй,

Беларуская гаворка

Над усё мне даражэй.

*А. Мілюць.*

- Раскажыце словамі з верша, за што паэт шчыра любіць беларускую зямельку?

Бо радзімая старонка

Над усё мне прыгажэй,

Беларуская гаворка

Над усё мне даражэй.

- Паўтарыце гэтыя словы ўсе разам – гучна і з гонарам за родную старонку.

- Складзіце апавяданне пра нашу краіну, пра тое якая Беларусь, як вы яе любіце і ганарыцеся ёю.

## Тэма. Мае забавы зімой.

**Расказванне верша Я. Коласа “Зіма”. Завучванне напамяць верша Л. Геніюш “ На каньках”**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест:*развіваць у выхаванцаў уменне адчуваць і разумець вобразную мову паэтычных твораў, суадносіць прыгажосць зімовых прыкмет, адлюстраваных на карціне з апісаннем зімовай прыроды ў вершах. Развіваць у дашкольнікаў выразнасць голасу пры чытанні верша па ролях, інтанацыйнаую разнастайнасць перадачы тэксту ў залежнасці ад яго зместу.

*Матэрыл:* рэпрадукцыя карціны А.С. Бархаткова “Люты”

Ход

- Паглядзіце на гэтую рэпрадукцыю. Якая пара года на ёй адлюстравана?

- Назавіце зімовыя прыкметы, якія вы убачылі на рэпрадукцыі карціны А.С. Бархаткова.

- Для якога зімовага месяца характэрныя такія прыкметы?
- Так, для лютага. Рэпрадукцыя А.С. Бархаткова так і называецца “ Люты”
- Калі разглядаеш гэтую карціну на памяць прыходзяць радкі з верша Я. Коласа “ Зіма”.

**Зіма**

Надышлі марозы,

Рэчкі закавалі,

Белыя бярозы

Шэранем убралі.

Пад пялёнкай белай

Травы і лісточкі.

Рэчка анямела,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Змоўклі ручаёчкі.

*Я. Колас*

- Пра якія зімовыя прыкметы  расказваецца ў вершы?

- Паэт адзначае, што "надышлі марозы  і  рэчка анямела, змоўклі ручаёчкі". Як можна сказаць пра гэтую з'яву інакш? Што стала з рэчкай і ручаёчкамі?

- У вершы таксама гаворыцца, што марозы ўбралі белыя бярозы шэранем. Як пра гэтую з'яву можна сказаць інакш?

- Як вы разумееце радкі з верша "Пад плёнкай белай травы і лісточкі".

-  Што ў вершы параўноўваецца з белай плёнкай? З чым яшчэ можна параўнаць снег?

- Назавіце вашы любімыя зімовыя забавы?

- Пра тое, як дзеці катаюцца ўзімку на каньках напісала ў сваім вершы Л. Геніюш. Верш так і называецца  "На каньках".

**На каньках**

Вечар, лёд у агнях,
А над ёлкай месяц.
Едуць, едуць на каньках
Міхасёк з Алесем.
Бачаць хлопцы: Таня
То ўпадзе, то ўстане.
- Ой, ізноў я на баку!
- Дай хутчэй, Алесь, руку.
- То трымайся, калі ласка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Дапаможа і Міхаська.

Мы дзяўчатак анідзе

Не пакінем у бядзе.

*Л. Генiюш*

- Назавіце імёны дзяцей, якія катаюцца на каньках?

- Раскажыце словамі з верша ў якую пару сутак Міхасёк , Алесь і Таня катаюцца на каньках.

- Як Таня ездзіць на каньках?

- Перадайце словамі з верша размову Тані з Алесем.

- Перадайце выразна радкі, дзе Таня просіць, каб Алесь ёй дапамог.

- Раскажыце радкі верша, у якіх Алесь ўпэўнівае, што хлопчыкі не пакінуць нікога ў бядзе.

- Паслухайце гэты верш, будзем расказваць яго напамяць.

-Паспрабуем расказаць гэты верш па ролях.

- Я буду расказваць верш за аўтара, а Аліна і Юрась будуць мне дапамагаць.Аліна будзе расказваць, тыя радкі верша, што гаварыла Таня, а Юрась, тыя радкі, што адказваў Алесь.

- Паслухайце верш яшчэ раз.

- Будзем расказваць яго разам. ( 2-3 разы з рознымі дзецьмі).

## Тэма. Звяры нашых лясоў

**Расказванне твораў А. Якімовіча «Звяры нашых лясоў, А. Вольскага «Вавёрка», « Дзівачок», В. Іпатавай «Вавёрка», П. Марціновіча «Клубочак»,**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест*: актывізаваць слоўнік выхаванцаў па тэме “Звяры нашых лясоў”, развіваць ўменне дзяцей заўважаць асаблівасці паэтычнай мовы. Вучыць іх адчуваць і разумець характар мастацкіх вобразаў ў творах. Развіваць у выхаванцаў уменне адлюстроўваць свае ўяўленні ад успрынятага мастацкага твора ў сваіх апавяданнях. Пабуджаць іх да ўключэння у звязнае выказванне слоў вершаў, вершаваных радкоў.

*Матэрыл:*карцінкі розных лясных звяроў.

Ход

- Ці ведаеце вы, што за звяры жывуць у лесе? Назавіце іх.

- Знайдзіце малюнкі, на якіх адлюстраваны звяры нашых лясоў. Назавіце гэтых звяроў.

- Паслухайце вершы А. Якімовіча пра звяроў, якія жывуць у лесе?

**Звяры нашых лясоў**

Звер вядомы ён
усім –
І старым, і дзецям:
Футра цёплае
на ім,
А завуць – мядзведзем.

Воўк на зайца
Вострыць зубы.
Уцякай, шарак,

Ад згубы!

Як дзяды, яны з барадамі,
Ходзяць цэлымі чародамі.
Проста дзіва – не звяры,
Называюцца – зубры.

Бабры – спакойныя звяры;
Хвасты ў іх, як лапаты.
Без тапароў і піл бабры
Сабе будуюць хаты.

Навастрыла вушы ліска,
Пачала ўглядацца:
Ці няма спажывы блізка –
Птушкі або зайца?

Пад'еўшы ўволю жалудоў,
Па сцежцы лесавой
Ікластых чарада дзікоў
Ідзе на вадапой.

Ну і рогі ў аленя!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Метраў два яны – не

меней.

Ад такой пагрозы

Уцякаюць козы.

А гэта вось –

Рагаты лось

З сямьёй сваёй уранку

Выходзіць на гулянку.

*А. Якімовіч*

*У час расказвання вершаў педагог паказвае малюнкі звяроў.*

- Што расказваецца ў вершы пра мядзведзя?

- Як расказваецца ў вершы пра ваўка і зайца?

- Што яшчэ вы можаце расказаць пра ваўка і зайца?

- Намалюйце воўка, але не фарбамі, а словамі.

- Намалюйце зайца, але не фарбамі, а словамі.

- Раскажыце словамі з верша, чаму зубры проста дзіва - не звяры?.
- Што вы даведаліся з верша пра баброў?
- Калі ліска навастрае свае вушкі?
- Апішыце , як выглядаюць дзікі?

- Што расказваецца ў вершы пра рогі аленя?

- Пра якога яшчэ рагатага звера расказваецца ў вершы?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Пра якіх звяроў леса не расказвалася ў гэтым вершы? Знайдзіце гэтых звяроў на малюнках, назавіце іх і пакажыце малюнкі.

- Паслухайце верш пра вавёрку, якая таксама жыве ў лесе.

**Вавёрка**

Яліна ў свет
глядзіць з пагорка
А на суку сядзіць
вавёрка.

Яна знайшла
ў ствале дупло
і ўладкавала тут
жытло.

Хай дождж,
хай снег,
хай завіруха,
а ў хатцы –
ўтульна, цёпла, суха.
І ежы,
скажам шчыра,
лішак:
аж да вясны

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ёй хопіць, шышак.

*А. Вольскі*

- Раскажыце словамі з верша, дзе ў лесе жыве вавёрка і, як яна падрыхтавалася да зімы?

- Пакажыце на малюнку яшчэ аднаго ляснога жыхара, пра якога не расказвалася ў вершах.

- Так, гэта калючы вожык.

- Паслухайце вершы пра яго.

**Клубочак**

Ну і дзіўны
Гэты вожык.
Не відаць
Ягоных ножак.

Не відаць
Ягоных вочак.
Ну не вожык,
А клубочак.

Ды клубочак
Дужа колкі,
Бо тырчаць з яго
Іголкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

І не выцягнеш

Іголку,

Воўк цягнуў яе

Без толку,

Не пашыў сабе

Абноў,

Толькі лапу

Пакалоў!

*П. Марціновіч*

- З чым у вершы параўноўваецца вожык?
- Чым адрозніваецца гэты клубочак ад звычайнага?
- Паслухайце верш пра маленькага хлопчыка і калючага вожыка, якога той знайшоў ў лесе.

**Дзівачок**

Вожык,

вожык,

дзівачок!

Не сціскайся

ў кулачок.

Я наліў

для дзівачка

поўны сподак

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

малачка.

Але вожык-дзівачок

не глядзіць

у гэты бок.

Малака

не хоча ён

і тупоча

на балкон.

Ды няма

з балкона сцежак –

ні лясной,

ні палявой

Толькі пахне

вецер свежы,

пахне лісцем

і травой!

*А. Вольскі*

- Чаму вожык не захацеў есці малако?

- У вершы гаворыцца, што малака не хоча вожык і тупоча на балкон, дзе“ толькі пахне вецер свежы, пахне лісцем і травой”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Чаму вожыка цягне на балкон?

- Аб чым напамінае вожыку свежы вецер, пах травы і лісця?

- Дзе сапраўдны дом вожыка? Куды ён хоча вярнуцца?

- Пакажыце карцінкі звяроў, з якімі вы пазнаёміліся ў вершах розных паэтаў. Паспрабуйце апісаць таго з іх, хто вам больш падабаецца. Выкарыстоўвайце ў сваіх апавяданнях словы з вершаў, якія вы сёння пачулі.

## Тэма. Вершы М. Багдановіча пра зіму

### Расказванне вершаў М. Багдановіча пра зіму.

*Праграмны змест:* пазнаёміць дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з вершамі М. Багдановіча, садзейнічаць развіццю ўмення дашкольнікаў разумець вобразную мову вершаў, практыкаваць іх ў падборы сінонімаў, у апісанні зімовай прыроды.

*Матэрыл:* ілюстрацыі, на якіх адлюстраваны зімовыя пейзажы.

Ход

- Паглядзіце на гэтыя ілюстрацыі.
- Назавіце зімовыя прыкметы, якія на іх адлюстраваны.
- Паслухайце верш М. Багдановіча “Зімой”

**Зімой**

Здароў, марозны, звонкі вечар!

Здароў, скрыпучы, мяккі снег!

Мяцель не вее, сціхнуў вецер,

І волен лёгкіх санак бег.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Як мары, белыя бярозы

Пад сінявой начной стаяць.

У небе зоркі ад марозу

Пахаладзеўшыя дрыжаць.

Вільготны  месяц стуль на поле

Празрысты, светлы стоўп спусціў

І рызай срэбнаю раздолле

Снягоў сінеючых пакрыў.

*М. Багдановіч*

- Якая пара сутак апісваецца ўзімку?
- Якія радкі з верша сведчаць, што на двары   стаіць марозны, звонкі вечар?
- Пра снег  гаворыцца, што ён скрыпучы, мяккі. Паэт піша пра сінеючыя снягі, пра пакрытае срэбнай рызаю раздолле. Якімі яшчэ прыгожымі словамі можна рассказаць пра снег?

- Ці заўважалі вы, якія змены назіраюцца ў прыродзе ў час завірухі? Раскажыце.

- Паслухайце, як расказвае пра завіруху ў сваім вершы   “Завіруха”    М. Багдановіч.

**Завіруха**

У бубны дахаў вецер б’е,

Грыміць па ім, звініць, пяе,

І спеў ліецца усё мацней, --

Гулянку справіў пан Падвей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У бубны дахаў вецер б'е,

Грыміць па ім, звініць, пяе.

Ўскіпела снежнае віно,

І белай пенай мкне яно.

У бубны дахаў вецер б'е,

Грыміць па ім , звініць, пяе.

Па вулках вее дзікі хмель,

Гудзіць сп'янелая мяцель.

У бубны дахаў вецер б'е,

Грыміць па ім, звініць, пяе.

*М. Багдановіч*

- Як апісвае паэт завіруху? У час завірухі у бубны дахаў вецер *... б'е,.. што яшчэ ён робіць? ... грыміць па ім, ...звініць,... пяе.*

- Ці выходзяць дзеці гуляць ў завіруху? Чаму?

- Падбярыце словы падобныя па свайму значэнню да слова "завіруха". Як пра завіруху можна сказаць інакш ?( завея, бура, пурга).

- Апішыце зімовы дзень у любую пару сутак : уранку, днём, увечары. Раскажыце, як выглядае неба, якія дрэвы, якая зямля, што робяць дзеці.

## Тэма. Свойскія птушкі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Расказванне вершаў “Певень” К. Камейшы, “ Курачка” Л. Геніюш.**

**Завучванне верша“Гусанькі” А. Дзеружынскага.**

*Праграмны змест:* актывізаваць слоўнік выхаванцаў па тэме “Свойскія птушкі”, развіваць іх здольнасць заўважаць асаблівасці паэтычнай мовы, Падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна выразна чытаць верш напамяць, суправаджаць расказванне верша гульнявымі дзеяннямі.

*Матэрыял:* карцінка “ На птушыным двары”

Ход

- Паглядзіце на малюнак і назавіце птушак, якіх вы бачыце на птушыным двары.

- Раскажыце, што вы ведаеце пра пеўніка.Апішыце пеўніка, як ён выглядае?

- Як прыгожа называюць пеўніка ў песеньках, казках?( пэвунок залаты грабенёк)

- Паслухайце верш пра пеўніка.

**Певень**

Па двары
У яркім пер’і
Ходзіць важна
Певень-спевень.

Заспявае –
і грабеньчык
Загарыцца,
як агеньчык.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А другі раз

заспявае –

Неба чырванню

зайграе.

Заспявае трэці раз –

Прачынацца нам пара.

*К. Камейша.*

- Ці падобна ваша апісанне пеўніка, на тое як ён апісаны ў вершы?

- Як прыгожа паэт называе пеўніка? ( певень-спевень)

- Чаму , на вашу думку, ён яго так называе?

- Колькі разоў спявае певень, каб разбудзіць нас уранку?

- Давайце разам раскажам, якія змены адбываюцца ў выглядзе пеўня і у прыродным наваколлі, калі ён пачынае спяваць . У першы яго спеў грабеньчык загарыцца як ... (агеньчык). Другі раз заспявае , то неба ... (чырванню зайграе). Заспявае трэці раз .. (прачынацца нам пара).

- Каго яшчэ можна сустрэць на птушыным двары?

- Раскажыце, што вы ведаеце пра курачку? Намалюйце курачку, але не фарбамі, а словамі.

- Паслухайце, што расказваецца пра курачку ў вершы Л. Геніюш “ Курачка”

**Курачка**

Выйшла курачка на снег,

Пагуляла трошкі.

Гэта ж гора, а не смех –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Босенькія ножкі.

Цыпка бегае па снезе,

Мёрзне з непрывычкі

На адну нагу прысела:

--Дайце чаравічкі!

*Л. Геніюш*

- Чаму курачка мёрзне з непрывычкі?
- Ці трэба ёй чаравічкі?
- Як дапамагчы курачцы, каб яна не мёрзла?
- Адгадайце загадку, якая птушка з тых, што на птушыным двары ў ёй апісваецца?
- На лапатах ходзіць, рогам есь .

Гуска

- Як вы здагадаліся, што гэта гуска?
- З чым параўноўваюцца лапкі гускі? Чаму?
- З чым параўноўваецца дзюбка гускі ? І сапраўды яна падобна на рог, моцная і доўгая.
- Паслухайце верш пра гусачак.

**Гусанькі**

- Дзе былі вы, гусанькі?
- -Га-га-га!.—

На беразе рэчанькі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

На лугах.

- Што рабілі, гусанькі?

- Скублі муражок,

Але там

Нас высачыў

Злосны шэры воўк.

-Як уратавацца

Ад яго змаглі?

-Га-га-га!-

На крылах

Хуценька ўцяклі.

*А. Дзеружынскі*

- Куды хадзілі гусанькі?
- Што яны рабілі  на беразе рэчанькі, на лугах?
- Хто іх там  высачыў?
- Як гусанькі ўратаваліся ад ваўка?
- Давайце разам пагуляем  па змесце гэтага вершыка.
- Вы будзеце гусанькі, а я буду гаспадыняй. ( Гуляюць разам з педагогам 2-3 разы)
- Цяпер выбярэм лічылкай гаспадыню, будзеце расказвайць верш  і гуляць ў гаспадыню і гусак самастойна.( 2-3 разы)

## Тэма. Вясна

**Чытанне верша «Вясна» В. Віткі.  Завучванне верша «Пралеска» В. Вярбы**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Праграмны змест:* развіваць уменне адчуваць і разумець паэтычную мову верша, падтрымліваць у дзяцей жаданне самастойна чытаць верш напамяць. Развіваць у выхаванцаў выразнасць голасу пры чытанні твора, інтанацыйна перадаваючы радасць абуджэння вясновай прыроды.

*Матэрыл :*букет пралесак.

Ход

- Паглядзіце, які прыгожы букецік кветак?
- З якіх кветак гэты букет?
- Калі цвітуць гэтыя кветкі?
- Назавіце першыя вясновыя кветкі, якія вы ведаеце?
- Паслухайце верш В. Віткі “Вясна”

**Вясна**

Паміж снегу ў лесе – дзіва.
Хто ні гляне, скажа: ах!
Я агеньчык зіхатлівы
Радасна нясу ў руках.

Горнуцца дубы, бярозы
Голлем да майго цяпла.
Больш не вернуцца марозы –
Я пралеску прынясла.

*В. Вітка*

- Што за дзіва прынесла вясна ў лес?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Як прыгожа называецца вясновая кветачка ў вершы?

- Раскажыце словамі з верша хто разам з кветкай горнецца сваімі галінкамі да цяпла, якое прынесла вясна?

- Чаму марозы ўжо больш не вернуцца?

- Паслухайце верш В. Вярбы пра першую вясновую кветачку – “ Пралеска”

**Пралеска**

Белыя бярозы
Спалі на ўзлеску,
Як сваю галоўку
Узняла пралеска.
Тоненькую ножку
З-пад пярыны белай
На зямлю пралеска
Ставіла нясмела.
А снягі наўкола –
Ні канца, ні краю,
Страшна стала кветцы:
“ Я адна – жывая!”
Кажа зверху сонца:
“Зорачка лясная,
З новым нараджэннем
Я цябе вітаю!”
Белыя бярозы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Разам зашапталі:

“ Мы цябе, пралеска,

Усю зіму чакалі”.

І старая елка

Голасна ўздыхнула:

“Вясна надыходзіць,

А зіма мінула”.

*Вера Вярба*

- Раскажыце пра паяўленне пралескі словамі з верша.
- Як вы разумееце выраз: “Тоненькую ножку з-пад пярыны белай на зямлю пралеска ставіла нясмела”.
- Чаму страшна стала кветцы, калі яна паявілася на свет?
- Як яе вітала сонейка?
- Як яе сустрэлі белыя бярозы?
- Аб чым паведаміла старая елка?
- Паслухайце верш яшчэ раз, будзем яго расказваць напамяць. Каб вам было расказваць лягчэй я пастаўлю вось гэтыя малюнкі. Спачатку белыя бярозы, потым пралеску, далей пакрытую белым снегам нібыта пярынай зямлю, сонейка, зноў белыя бярозы і, нарэшце, старую елку. Цяпер слухайце верш яшчэ раз і паспрабуйце яго расказаць, а дапамагаць вам будуць вось гэтыя малюнкі. ( Расказваюць 4-5 дзетак).

**Тэма. Вясна**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Расказванне верша Я. Коласа « Раніца вясною». Завучванне верша Я. Коласа «Песня аб вясне»

*Праграмны змест*: развіваць у выхаванцаў здольнасць успрымаць музыкальнасць паэтычнага маўлення, адчуваць і разумець паэтычныя вобразы вясновай прыроды. Пабуджаць пры самастойным расказванні верша перадаваць з дапамогай інтанацыі радасць ад прыходу вясны, свае адносіны да вершаванага зместу.

Ход

- Назавіце, тыя змены, якія вы заўважылі ў прыродзе , калі сёння раніцай ішлі ў дзіцячы садок .
- Для якой пары года характэрны такія прыкметы?
- Паслухайце, як расказвае Я.Колас пра вясновыя прыкметы , якія ён таксама заўважыў раніцай вясною.Верш так і называецца “Раніца вясною”.

**Раніца вясною**

Ціха ў поле, ціха ў лесе
Ані шэпне вецярок,
Толькі дзесь у паднябессі
Льецца звонкі галасок.
На ўсходзе бляск агністы
Літым золатам дрыжыць,
Слуп высокі, прамяністы
Роўным полымем гарыць.
Тонкіх хмарак валаконцы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Сталі хораша ў радок,

Як бы ўюць яны для сонца

З тых валоканцаў вянок.

Ціха ў полі, ціха ў лесе,

Чуць балбоча ручаёк,

А высока ў паднябессі

Льецца звонкі галасок.

*Якуб Колас*

- Якія вясновыя прыкметы заўважыў паэт вясновым ранкам?

- Раскажыце пра іх словамі з верша.

- Ці чулі і вы сёння ўранку птушыныя спевы?

- Якія хмаркі вы ўбачылі на небе?

- Ці падобны яны на тыя, што апісвае Я. Колас ў вершы?

- Раскажыце пра іх словамі з верша.

---

- Ці заўважылі вы раўчукі абапал дарогі?

- Паэт піша ў вершы, што ручаёк чуць балбоча. Як можна сказаць пра гэта іншымі словамі? ( цячэ, ліецца, пераліваецца, звоніць).

- Вы назіралі за вясновымі прыкметамі ў горадзе ( вёсцы), а дзе назіраў гэтыя прыкметы Я. Колас?

- Якія словы з верша вам гэта падказалі?

- Прыгожа апісвае Я. Колас раніцу вясной . Паслухайце яшчэ адзін яго верш пра вясну.

**Песня аб вясне**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Уцякай, мароз-дзядуля!

Чуеш ты, стары, ці не?

На пагорках – Булі-гулі!—

Песні чуюцца вясне.

Звоніць, скача, як дзіцятка,

Гэты жэўжык-ручаёк.

На яго, бы тая матка,

Сонца кідае свой зрок.

А ён , гучны і смяшлівы,

Так і ходзіць, аж дрыжыць,

І другі сябрук шчаслівы

Насустрач яму бяжыць.

А зіма аж пачарнела –

Годзе ёй тут кросны ткаць!..

Гэй, маленства, жыва, смела

Выйдзем весну прывітаць!

*Я. Колас*

- Назавіце, вясновыя прыкметы, пра якія расказваецца ў гэтым вершы?

- Чаму Мароза-Дзядулю просяць, каб ён хутчэй уцякаў?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Паўтарыце просьбу да Дзеда –Мароза так, каб ён яе адразу пачуў і саступіў дарогу вясне.

Уцякай, мароз-дзядуля!

Чуеш ты, стары, ці не?

На пагорках – Булі-гулі!—

Песні чуюющца вясне.

- Як радуецца вясне жэўжык-ручаёк?

- Раскажыце пра ручаёк і яго сябрука словамі з верша, так каб адчувалася, што ён радуецца цёпламу вясноваму сонейку, якое нібы «тая матка на яго кідае свой зрок».

- Што стала з зімой? Раскажыце пра зіму словамі з верша.

- Як запрашае паэт вітаць вясну? Паўтарыце гэтыя словы з клічнай інтанацыяй.

Гэй, маленства, жыва, смела

Выйдзем весну прывітаць!

- Паслухайце верш яшчэ раз, будзем расказваць яго напамяць.( Расказваюць 4-5 дзяцей).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма. Свята мам

### Завучванне верша М. Хведаровіча «Дарагое імя»

*Праграмны змест:* падтрымліваць развіццё здольнасці ў выхаванцаў заўважаць асаблівасці паэтычнай мовы. Вызваць у дзяцей радасны эмацыянальны настрой, дапамагчы ім выразіць свае адносіны, любоў да маці праз паэзію.

Матэрыял: фотаздымкі матуль дзяцей групы.

Ход

- Хто для вас самы дарагі чалавек на свеце?
- Пакажыце фотаздымкі вашых матуль.
- Як ласкава вы завеце сваю маці?
- Паслухайце верш М. Хведаровіча “ Дарагое імя”

**Дарагое имя**

Свеціць, як сонца,
Ад самай калыскі
Вобраз любімы,
Родны і блізкі.

Маміна імя
Самае лепшае,
Маміна слова найдаражэйшае.
Мама! Матуля! –
Чароўнае слова
Песняй ласкавай
Гучыць на усіх мовах.

*М. Хведаровіч*

- Якім чароўным словам называе паэт вобраз “ любімы, родны і блізкі”, што “нам свеціць, як сонца ад самай калыскі” ў вершы?

-Раскажыце словамі з верша, як гэтае слова гучыць на ўсіх мовах?

- Чаму гэтае слова самае дарагое?

- Паслухайце верш яшчэ раз, будзем вучыць яго напамяць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Пастарайцеся расказаць гэты верш пяшчотна, с замілаваннем, з любоўю да сваёй матулі.

## Тэма. Вясёлыя вершы

### Чытанне вясёлых вершаў

*Праграмны змест*: працягваць вучыць дзяцей разумець гумарыстычны сэнс вершаў, заўважаць недакладнасці ў іх змесце; дапамагчы выхаванцам асэнсаваць значэнне вобразных слоў і выразаў ў тэксце паэтычных твораў; вызываць пры чытанні вершаў радасны эмацыянальны настрой.

*Матэрыял:* жазло рэгуліроўшчыка.

Ход

- Раскажыце свае любімыя вершы.
- Які ў вас быў настрой пры чытанні сваіх любімых вершаў?
- Ёсць розныя вершы: вясёлыя, радасныя, бадзёрыя, сумныя. Есць нават такія вершы, што калі іх расказваюць, адразу мяняецца настрой і хочацца смяяцца.
- Ці любіце вы такія вершы?
- Хто з вас ведае вясёлыя вершы? Раскажыце.
- Паслухайце, якія вясёлыя вершы раскажу вам я?

**Жарт**

Проста жах –

Гарыць калодзеж,

Аж пад неба

Полымя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Чым астудзіш,

Ахалодзіш?

Не рукамі голымі!

Што рабіць?

Бяда

Адна –

Выгарыць

Вада

Да дна.

Што рабіць

І што рашыць?

Як ваду

Вадой тушыць?!

*Р. Барадулін.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Што недарэчнага ў гэтым вершы?

- Як вы думаеце, ці можа гарэць калодзеж?

- Паслухайце яшчэ адзін верш, які называецца «Ці так» і здагадайцеся, ці бывае так у сапраўдным жыцці.

**Ці так**

У вадзе жывуць вавёркі,

У дупле жывуць бабры.

Совы – у возеры глыбокім,

А самы – ў густым бары.

Пчолы спяць зіму ў бярлозе,

А мядзведзі – у вуллі.

Конь спявае на бярозе,

Вераб'я ў плуг запраглі.

*М. Пазнякоў*

- Чаму пры чытанні гэтага верша вы усміхаліся?
- Адкажыце, ці так бывае на самой справе?
- Давайце разам раскажам верш правільна.
- Вось яшчэ адзін верш. Напісаў яго Р. Барадулін. Называецца ён “Зай-рэгуліроўшчык”.

**Зай-рэгуліроўшчык**

Зай-рэгуліроўшчык

Атрымаў жазло

Ані ў кога

Лепшага

Пэўна не было.

Морквінка чырвоная,

А зялёны хвост

Паказвае –

Рухайся наўпрост.

Морквінку чырвоную

Раптам узнясе –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Рух увесь

Спыняецца

І стаяць

Усе.

У рэгуліроўшчыка

Усё ішло

Як след.

Толькі непрыкметна

Падышоў абед.

З'еў

Святло зялёнае

Зайчык пакрысе.

І на шумнай вуліцы

Згрудзіліся ўсе

А калі чырвонае

Згрыз

Святло

Паціху –

Выпусціў на вуліцу

Зай

Неразбярыху.

*Р. Барадулін*

- Што незвычайнага ў гэтым вершы?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Ці можа быць морква жазлом рэгуліроўчыка?
- Пакажыце сапраўднае жазло рэгуліроўшчыка, вазьміце яго ў рукі , пакажыце, як спыніць жазлом рух, даць каманду на рух транспарту.
- Ці спадабаўся вам гэты верш?
- Раскажыце змест гэтага верша ўвечары сваім бацькам.

## Тэма. Прадукты харчавання.

### Расказванне вершаў В. Віткі " Малыя Аленікі", А. Дзеружынскага «Хлебная скарынка», І. Муравейкі "Акраец хлеба"

*Праграмны змест:* працягваць развіваць у дзяцей уменне разумець змест вершаваных тэкстаў, паэтычны слых. Выхоўваць у іх сумленные і паважлівыя адносіны да хлеба, да чалавека працы.

Ход

- Учора мы з вамі назіралі за вітрынай магазіна. Якія прадукты харчавання вы пабачылі ў вітрыне магазіна?

- Якія прадукты харчавання ў вас самыя любімыя?

- Паслухайце лічылку В. Віткі. Запомніце, пра якія прадукты харчавання ў ёй расказваецца?

**Малыя аленікі**

Малыя аленікі,
Елі варэнікі,

Бегемот – ананасы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

А янот – бульбу з квасам.

Журавель – журавіны,

А жырафа – апельсіны,

Жук жур жор,

Тхор сыр цёр,

Грызла рысь рыс,

Барбос – барбарыс,

Вам наце

Па аладцы,

Табе, браце, --

Закрывацца.

*В. Вітка*

- Ці  запомнілі вы, што еў кожны са звяроў?

- Паслухайце лічылку яшчэ раз .

- Давайце раскажам гэтую лічылку . А дапамогуць нам карцінкі з выявай звяроў і прадуктаў харчавання.

- Спачатку я буду расказваць лічылку і паказваць карцінкі з выявамі звяроў, а вы называць прадукты харчавання, якімі яны частуюцца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Цяпер будзем расказваць разам. Я буду расказваць лічылку і паказваць карцінкі з выявамі звяроў і прадуктаў харчавання, а вы разам са мной называць гэтых звяроў і прадукты харчавання, якімі яны частуюцца.Расказваюць 2-3 дзетак.

- Самы галоўны прадукт харчавання –хлеб. Хлеб—усяму галава.

- Чым пахне хлеб?

- Паслухайце, як расказвае пра пах хлебнай скарынкі у сваім вершы А. Дзеружынскі.

**Хлебная скарынка**

Пахне

Хлебная скарынка

Цёплым ветрыкам

Хваінкай

Летнім дожджыкам

Грыбным

Лугам,

Полем аржаным,

І асенняй пазалотай,

Ды натхнёнаю работай.

*А. Дзеружынскі.*

- Давайце яшчэ раз разам раскажам, чым пахне хлебная скарынка?

- Як вы разумееце выраз, што хлебная скарынка пахне "натхнёнаю работай"?

- Як трэба папрацаваць, каб атрымаць булку хлеба?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Паслухайце яшчэ адзін верш пра хлеб, называецца ён “Акраец хлеба”, напісаў яго І. Муравейка

***Акраец хлеба***

Хлеб на стале.

Хлеб на стале.

Кулідка – сонца палавіна.

Як пахне свежы чорны хлеб!

І маці кліча ў хату сына.

Кулідку са стала ўзяла

З замілаваннем, асцярожна.

Адрэзала і падала

Акрайчык сыну:

- Еш, Сярожа...

А той, скрывіўся і сказаў:

- Памаж мне, мама, трошкі мёдам.

Адразу мёд увесь злізаў

І – да парога:

- Хлеб з'ем потым.

- Ну што ж , сынок, хай будзе «потым».

Ды нікуды ты не бяжы:

У нас з табою ёсць работа –

Памыць мне посуд памажы.

Сын з мамай працаваў старанна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Намылі цэлую гару

Талерак, сподачак і шклянак,

Відэльцаў, лыжак і каструль.

- Ну, мы на рэчку пойдзем з Данем...

- Не , ты нікуды не бяжы.

Яшчэ адно ў нас заданне:

Граду ўскапаць мне памажы.

І закіпела зноў работа.

Сярожа нават упацеў.

- А мне, сын, есці ўжо ахвота...

- І я таксама захацеў...

Хлеб на стале.

Хлеб на стале

Кулідка – сонца палавіна.

Як пахне свежы чорны хлеб!

Ідуць у хату маці з сынам.

Кулідку са стала ўзяла

З замілаваннем, асцярожна.

Адкроіла і падала

Акраец сыну:

- Еш, Сярожа...

Сяргей, як мама,

Сеў за стол.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Акраец з'еў.

Без мёду нават.

- Смачнейшы гэты хлеб

за той, што ты мне раніцай давала.

*І. Муравейка*

- Чаму хлеб у абед здаўся хлопчыку смачнейшым за ранішні?

## Тэма. Лета

### Завучванне верша Г. Івановай "Сонейка-сонца"

*Праграмны змест*: развіваць паэтычны слых, вобразнае маўленне; заахвочваць дзяцей да адгадвання загадак, разумення выразных сродкаў мовы. Падтрымліваць у выхаванцаў жаданне самастойна чытаць верш напамяць. Развіваць у іх выразнасць голасу пры чытанні верша.

Ход

- Паслухайце загадкі і назавіце адгадкі .

Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць.

Гром.

- Што дапамагло вам адгадаць загадку?

- Паўтарыце, як расказваецца ў загадцы пра гром.

І шуміць, і гудзе, на ўвесь свет голас ідзе.

Вецер.

- Што вам падказала адгадку?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- У загадцы расказваецца, што ветрык шуміць, гудзе. Якія яшчэ яго дзеянні вы ведаеце?

Насупіцца, нахмурыцца, у слёзы ўдарыцца – нічога не застанецца.

Хмара.

- Пра што гэтая загадка?

- Калі хмарка так выглядае?

- Як выглядае хмарка ў дождж.

Тонкі, доўгі, а ўпадзе – з травы не відаць.

Дождж.

- Што апісваецца ў гэтай загадцы?
- Пра дождж расказваецца, што ён тонкі і доўгі. Апішыце, якія яшчэ якасці ў дожджыка?

Мяне ўсе просяць, мяне ўсе чакаюць, а як толькі з’яўлюся, хавацца пачынаюць.

Дождж.

- Пра што гэтая загадка?

- Чаму ад дожджыка ўсе хавацца пачынаюць?

Цераз палі, цераз лугі спусціліся канцы дугі.

Вясёлка

- Што падказала вам адгадку на гэтую загадку?

- Дуга гэтая незвычайная. Назавіце колеры вясёлкі. Чаму яна мае такую назву?

Ішла панна ўначы, згубіла ключы, месяц бачыў, а сонца падняло.

Раса.

- Аб чым гэтая загадка?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

- Што можна заўважыць на траўцы позна ўвечары і што знікае з першымі промнямі сонейка ўранку?

- Якая раса, раскажы пра яе якасці.

Жыве без цела, гаворыць без языка, ніхто не бачыць, а ўсякі чуе.

Рэха.

- Што падказала табе адгадку на загадку?

- Апішы яшчэ раз словамі з загадкі якасці рэха.

- Пра якія прыродныя з'явы расказваецца ў гэтых загадках.

- Вось яшчэ адна загадка.

Залаценькае, кругленькае – усяму свету міленькае.

- Што міленькае ўсяму беламу свету?

- Як апісваецца сонейка ў загадцы?

- Паслухайце верш пра сонейка?

**Сонейка-сонца**

Сонейка-сонца,
Залатое донца,
Не хавайся ў бары,
а гары,
гары,
гары!
Ну –
хоць трохі пасвяці,
каб нам спаць не ісці!

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Г. Іванова*

- Як прыгожа называюць дзеткі сонца?

- З чым параўноўваецца сонейка ў вершы?

- З чым яшчэ можна параўнаць сонейка?

- Чаго просяць малыя ў сонейка?

- Паўтарыце іх просьбу так, каб сонейка пачула яе.

- Паслухайце заклічку да сонейка яшчэ раз.

- Будзем расказваць яе напамяць. Расказваюць 4-5 дзяцей.

## Тэма. Правы дзяцей

### Расказванне верша А. Вольскага "Дзеці"

*Праграмны змест:* замацоўваць ў дзяцей уменне разумець змест вершаваных радкоў іх сэнс. Пабуджаць выхаванцаў да расказвання вершаваных радкоў з клічнай інтанацыяй. Выхоўваць пачуццё любві і сяброўства паміж дзецьмі, якія жывуць у розных краінах свету.

*Матэрыл:* малюнкі аб жыцці дзяцей у розных краінах свету.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ход

- Якая ў вас самая любімая гульня?

- Давайце разам у яе пагуляем.

- Паглядзіце на гэтыя малюнкі. Каго вы на іх бачыце?

- Гэтыя дзеці жывуць у розных краінах свету. У іх таксама ёсць любімыя гульні, у якія яны любяць гуляць. Як і дарослыя , дзеці маюць права на жыццё, права

на адукацыю, права на адпачынак, права на тое, каб жыць ў шчаслівай сям'і, права на мірнае жыццё без вайны і яшчэ шмат іншых праў. Гэтыя правы дзяцей ў некаторых краінах парушаюцца .

- Паслухайце верш А. Вольскага "Дзеці", у якім расказваецца пра розных дзяцей нашай планеты.

**Дзеці**

Розныя дзеці
Жывуць на планеце –
Белыя,
            Жоўтыя,
Чорныя дзеці.
Розныя дзеці –
Аднолькавы смех.
Смех
            У хвіліны
Забаў і пацех.
Розныя дзеці –
І розныя вочы,
Вочы –
              як неба.
Вочы –
              як ночы.
Вочы, што мора

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ўвабралі глыбіні,

Вочы –

пад колер

Бязводнай пустыні.

Розныя вочы –

Адзіныя слёзы.

Слёзы—

Ў хвіліны

Бяды ці пагрозы.

Вось бы зрабіць,

Каб на нашай планеце

Гора не ведалі

Розныя дзеці!

Вось бы зрабіць,

Каб у розных дзяцей

Радасць гасціла

Даўжэй

І часцей!

*А. Вольскі*

- Што рознага ў дзяцей нашай планеты?
- Што аднолькавага ў дзяцей нашай планеты?
- Да чаго заклікае паэт дарослых?
- Паслухайце яшчэ раз гэтыя словы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вось бы зрабіць,

Каб на нашай планеце

Гора не ведалі

Розныя дзеці!

Вось бы зрабіць,

Каб у розных дзяцей

Радасць гасціла

Даўжэй

- Паслухайце яшчэ раз  заклік паэта і паўтарыце яго з клічнай інтанацыяй.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ